# Нашчадкі Скарыны

Выдавецкі праект «Кніжная спадчына Францыска Скарыны» ўражвае маштабнасцю. Прымеркаваны да 500-годдзя айчыннага кнігадрукавання, якое будзе святкавацца сёлета, ён ажыццяўляўся на працягу некалькіх гадоў. Афіцыйны старт быў дадзены напрыканцы снежня 2014-га. Ініцыятарамі і асноўнымі выканаўцамі выступілі банк БелВЭБ і Нацыянальная бібліятэка.




Працу над факсімільным выданнем спадчыны Скарыны Канстанцін ВАШЧАНКА лічыць для сябе самай значнай
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Факсімільнае выданне максімальна поўна аднаўляе кнігі Францыска Скарыны. У іх захаваны структура, змест, асаблівасці шрыфтоў і гравюр арыгінальных выданняў, перададзены ўсе штрыхі, набытыя на працягу 500-гадовага існавання. Усе тэксты выданняў суправаджаюцца каментарыямі вучоных, перакладамі прадмоў і пасляслоўяў Францыска Скарыны на беларускую, рускую і англійскую мовы.

25 кніг у 20 тамах — поўны збор таго, што было надрукавана Францыскам Скарынай у Празе і Вільні. Аснову факсімільнага выдання складаюць электронныя копіі захаваных кніг першадрукара, якія знахо-дзяцца ў

бібліятэках і музеях Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і іншых краін.

Вядомы мастак-графік Канстанцін Вашчанка, які афармляў мнагатомнае выданне, не скрывае гонару, што атрымаў рэдкую магчымасць працаваць з унікальнымі матэрыяламі:

— Было надзвычай цікава і адказна. Зразумела, раней бачыў копіі ілюстрацый Скарыны, а тут у руках давялося патрымаць нават некаторыя ары-гіналы. Вельмі ўразіла! Наогул, працы такога маштабу і значнасці мне раней выконваць не даводзілася, думаю, наўрад ці калі яшчэ прыйдзецца.

Ці былі цяжкасці? Самым складаным, гаворыць мастак, было падтрымліваць стыль Скарыны, каб макет атрымаўся і не рэтра, і не надта авангардны, каб выглядаў арганічна.

— Калі вучыўся ў тэатральна-мастацкім інстытуце, адзін з педагогаў, вядомы ілюстратар Аляксандр Шэвераў гаварыў нам: у працы не павінна быць бачна поту. Гэта і было тым, чаго мне хацелася дабіцца. Так я і стараўся зрабіць. І, на мой погляд, атрымалася: проста, неназойліва і арганічна.

Пацвярджэнне поспеху — высокая адзнака дзяржавы. Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва Канстанцін Вашчанка адзначаны за высокі прафесіяналізм у афармленні шматтомнага факсімільнага выдання, дакладную перадачу ладу эпохі Францыска Скарыны і адпаведнасці гістарычнай значнасці першадрукара.

Ірына СВІРКО